# САМОТНЫ ПРАПАВЕДНІК ЦІ «АГЕНТ КСЯНДЗА»: ВЫПАДАК МІЖКАНФЕСІЙНАЙ НАПРУЖАНАСЦІ Ў ДЗІСЕНСКІМ ПАВЕЦЕ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*М. М. Кароль*
*(Мінск, Беларусь*

Супярэчлівая рэлігійная сітуацыя, якая склалася на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст., была шмат у чым абумоўлена нераўназначным статусам канфесій у Расійскай імперыі. Заканадаўчае абмежаванне дзейнасці каталіцкай царквы прыводзіла да праблем для шараговых вернікаў, пазбаўленых права на самастойны духоўны выбар.

Місіянерская актыўнасць з боку неправаслаўных цэркваў была забаронена, публічныя выказванні аб дактрынальных і побытавых перавагах каталіцызму рабіліся падставай для завядзення спраў аб «спакушэнні» вернікаў з праваслаўя. Паводле такога артыкула ў 1900 і 1902 гг. быў прыцягнуты да адказнасці селянін Дрысенскага павета Віцебскай губерні Аляксандр (Аляксей) Міхайлавіч Рэут. Ён абвінавачваўся ў прапагандзе каталіцызму сярод насельніцтва суседняга Дзісенскага павета Віленскай губерні. Гэты выпадак выклікаў пільную ўвагу царкоўнай (праваслаўнай) і свецкай адміністрацыі, бо А. Рэут дзейнічаў адкрыта і зацята, заклікаў праваслаўных прыняць каталіцтва і накіравацца ў пілігрымку ў вядомы каталіцкі санктуарый у Чанстахова. Апрача таго, такая індывідуальная пропаведзь, па ўсёй верагоднасці, стала адной з праяў міжканфесійнага процістаяння, бо праваслаўныя святары падазравалі ікязненскага ксяндза Філіпа Будвіта ў заахвочванні захадаў А. Рэута.

Дадзеныя падзеі пераважна разгортваліся ў канцы вясны – пачатку лета 1900 г. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета, куды ў гэты час прыбыў селянін вёскі Вознава Сар'янскай воласці Дрысенскага павета 25-гадовы Аляксандр Рэут. Гэтая асоба ўжо прыцягвала ўвагу

ўлад. Нягледзячы на фармальна праваслаўнае веравызнанне, А. Рэут звяртаўся да браслаўскага святара з просьбай змяніць занатаваную ў пашпарце канфесійную прыналежнасць на каталіцкую, больш за тое, ён агітаваў іншых людзей у Браслаўскім прыходзе пераходзіць у заходні абрад. У выніку ён апынуўся пад паліцэйскім наглядам і быў прымусова адпраўлены дадому [1, арк. 17–17 адв., 20–20 адв.].

Аднак гэта не спыніла прапаведніцкую актыўнасць А. Рэута, якую ён працягнуў якраз у Ёдскай воласці – у размешчанай там вёсцы Укля. Падзеі, які адбываліся з удзелам А. Рэута, вядомы нам у некалькіх пераказах, якія адрозніваюцца акцэнтамі. Афіцыйны пункт погляду мясцовых праваслаўных святароў агучыў святар Іказненскай царквы Міхаіл Квяткоўскі. Пры гэтым, паводле яго звестак, выкладзеных у рапарце ад 15 ліпеня 1900 г., пракаталіцкая агітацыя А. Рэута ў вёсцы Укля скончылася нічым.

Святар не аддаваў А. Рэуту ролю галоўнага завадатара «спакушэння» мясцовых праваслаўных у каталіцызм. М. Квяткоўскі паведамляў, што А. Рэут з'явіўся ў вёску Укля і пачаў там прапаведваць аб перавагах каталіцызму над праваслаўем, а таксама збіраў жадаючых зрабіцца «сапраўднымі каталікамі», каб ехаць з ім у Чанстахова. Але святар меркаваў, што «спакушэнне» часткі мясцовых прыхаджан, якія пагадзіліся на намовы А. Рэута і нават былі гатовы выпраўляцца ў Чанстахова, адбылося раней. М. Квяткоўскі сцвярджаў, што такі таемны адыход ад праваслаўя стаў вынікам дзейнасці іказненскага ксяндза Філіпа Будвіта [1, арк. 9–9 адв.].

Спасылаючыся на бліжэй неакрэсленыя звесткі ад мясцовых жыхароў, М. Квяткоўскі выстаўляў А. Рэута адным са шматлікіх «агентаў» ксяндза Ф. Будвіта, якія нібыта займаліся процізаконным распаўсюджваннем каталіцызму сярод праваслаўных. Праваслаўны святар перадаваў змест іх дзейнасці наступным чынам: яны хадзілі па вёсках і распавядалі пра перавагі каталіцызму над праваслаўем, нібыта што апошняе паходзіць ад цара, а не ад Бога, пры гэтым

сам цар быццам бы меў намер прыняць каталіцызм, а «ўсё рускае, роднае знішчыць» [1, арк. 9]. Па падліках М. Квяткоўскага, у Іказненскім прыходзе ўжо было каля 200 чалавек, які хоць з'яўляліся фармальна праваслаўных, фактычна вызнавалі каталіцызм. Святар прызнаваў, што ён не можа нічога супрацьпаставіць імкненню часткі насельніцтва вызнаваць каталіцызм. Галоўным вінаватым у гэтым М. Квяткоўскі абвяшчаў менавіта ксяндза Ф. Будвіта [1, арк. 9 адв.]. Такое становішча, на думку М. Квяткоўскага, садзейнічала патэнцыйнаму поспеху пропаведзі А. Рэута, які не адбыўся толькі з-за таго, што апошні быў своечасова высланы з Ёдскай воласці.

Крыху інакш апісвалі справу мясцовыя сяляне. У сярэдзіне мая 1900 г. яны звярнуліся да паліцэйскага ўрадніка Бугаева і паведамілі, што ў вёсцы Укля з'явіўся невядомы. Непасрэдна Антон Аўсюкевіч і Іван Кіслы сцвярджалі, што гэты незнаёмец хадзіў па дамах тых, хто ўжо «спакусіўся» ў каталіцызм і заклікаў іх паехаць у Чанстахова, каб стаць там сапраўднымі каталікамі. Апрача таго, ён збіраў з таемных каталікоў грошы на арганізацыю пілігрымкі – па 5 рублёў 50 капеек (пры гэтым даводзіў сялянам, што рух сваім ходам чыгункай будзе каштаваць даражэй – 10 рублёў) [1, арк. 11].

Сяляне паведамілі, што гэты невядомы ўзяў з сабой чатырох дзяўчат, якія фармальна лічыліся праваслаўныя: Настассю Аўсюкевіч, Фёклу, Александрыну і Ганну Латышонак. Усе разам яны праз некалькі дзён выправіліся ў касцёл у мястэчка Іказнь [1, арк. 11].

У выніку паліцэйскі ўраднік Бугаеў у прысутнасці згаданых вышэй А. Аўсюкевіча і І. Кіслага, а таксама селяніна мястэчка Іказнь Восіпа Пенькі затрымаў А. Рэўта, які на той момант не меў дакументаў, якія б пацвярджалі яго асобу і месца жыхарства. Пры гэтым А. Рэут паводзіў сябе дастаткова дзёрзка. Ён казаў «арыштуйце мяне, але за гэта заплаціце, і тады даведаецеся, хто я». Пры вобшуку ў яго былі знойдзены сцізорык вялікага памеру і двайны чорны кашалёк без грошай. А. Рэут быў пакінуты на ўтрыманне у

«арыштанцкім» пакоі пры станавай кватэры [1, арк. 13].

Як і праваслаўны святар, сяляне ўсведамлялі, што імкненне да маніфестацыі ўласнай каталіцкай ідэнтычнасці некаторымі жыхарамі вёскі Укля было толькі падбухторана, але не арганізавана А. Рэутам. Ужо да яго з’яўлення ў вёсцы меліся людзі, якія насуперак фармальнай прыналежнасці да праваслаўнай канфесіі, фактычна прытрымліваліся каталіцызму. Аднак у адрозненне ад М. Квяткоўскага, сяляне не рабілі акцэнт на ролі ксяндза ў падахвочванні А. Рэута і іншых жыхароў да прыняцця – таемнага ці адкрытага – каталіцызму. Па ўсёй верагоднасці, яны разумелі, што памкненні да вызнавання каталіцызму сыходзілі непасрэдна ад сялян, а не ад ксяндзоў ці нетутэйшых прапаведнікаў, падобных да А. Рэута.

Для разумення вытокаў такой міжрэлігійнай канфрантацыі неабходна мець на ўвазе становішча праваслаўнай і іншых хрысціянскіх цэркваў у Расійскай імперыі. У адпаведнасці з заканадаўствам XIX ст. праваслаўная царква мела статус пануючай у дзяржаве, а ўсе астатнія цэрквы траплялі пад вызначэнне «цярпімых» або забароненых. Больш за тое, займацца місіянерскай дзейнасцю і публічна прапаведаваць маглі толькі прадстаўнікі праваслаўнай канфесіі. У адваротным выпадку па ініцыятыве духоўнай асобы праваслаўнага веравызнання магло быць распачата следства па справе аб «спакушэнні» з праваслаўя [3, с. 366].

У тыя часы дзейнічаў закон, які забараняў прапаведаваць вучэнне іншых рэлігій у прысутнасці праваслаўных вернікаў. На практыцы гэта мела шырокія магчымасці для тлумачэння і прыцягнення да крымінальнай адказнасці прадстаўнікоў іншых веравызнанняў. Побытавая размова з вяскоўцамі магла паслужыць падставай для абвінавачвання ў «спакушэнні» праваслаўнага насельніцтва. Пры гэтым у выпадку А. Рэутам мы маем справу з сапраўднай індывідуальнай пропаведдзю. Відавочна, яму была ўласціва выразная і зацятая ўнутраная каталіцкая рэлігійнасць. Пра гэта ўскосна сведчыць тое, што падчас затрыманняў у яго неаднаразова знаходзілі характэрныя

для каталікоў прадметы рэлігійнага ўжытку: «шкаплеры, крыжы, ружанец і паясы святых» [1, арк. 10], флакон са святой вадой, ружанец з «двума медальёнамі і крыжыкамі», малыя шкаплеры [1, арк. 14], два вялікія крыжы, шкаплеры, «два нейкія шнуры, адпуставыя паводле польскага абраду» [1, арк. 15]. Верагодна, А. Рэут успрымаў сябе як місіянера, які садзейнічаў распаўсюджанню каталіцызму .

Трываласць А. Рэута і яго ўпэўненасць у сваёй «місіі» праявіліся і ў тым, што пасля падзей у Ёдскай воласці ён не спыніў сваёй пропаведзі. Тым самым летам, 4 чэрвеня 1900 г., ён з’явіўся ў мястэчку Іказнь, дзе сабраў вакол сябе натоўп, у якім таксама прысутнічалі «законніцы» (каталіцкія манахіні). Мясцовым жыхарам ён распавёў пра свой (па яго словах, незаконны) арышт ва Уклі, але абвясціў, што не спыніць пропаведзь, якой цяпер мае намер заняцца непасрэдна ў мястэчку Іказнь. Аднак, як і за месяц да гэтага, Аляксандр Рэут зноў трапіў пад арышт [1, арк. 3–3 адв.].

А. Рэут першапачаткова не быў «сваім» чалавекам для сялянскай супольнасці Ёдскай воласці Дзісенскага павета. Як ужо адзначалася, ён быў выхадцам з іншага, хай і памежнага павета. Таксама ўклянскія сяляне першапачаткова не ведалі, кім з’яўляецца гэты прапаведнік каталіцызму. Тым не менш, яго дзейнасць знаходзіла водгук у мясцовых жыхароў. Праз два гады пасля апісаных падзей, у 1902 г., паводле запыту праваслаўнага духавенства, у якасці падбухторшчыкаў да таемнага пераходу ў каталіцызм часткі сялян вёсак Солакаўшчына і Барадзінічы той самай Ёдскай воласці, разам з А. Рэутам павінны былі быць прыцягнуты да адказнасці мясцовыя жыхары Казімір Янавіч і яго жонка Бенядыкта Феліксаўна Пурвіны [1, арк. 23–24 адв.].

Такім чынам, выпадак А. Рэута дазваляе прасачыць, як адрознівалася ўспрыманне праяў адкрытай каталіцкай рэлігійнасці з боку саміх суб’ектаў такой дзейнасці, сялян, на якіх яна была накіравана, а таксама праваслаўнага святарства. Зацяты каталік (пры гэтым па дакументах праваслаўны) А. Рэут імкнуўся актывізаваць схаваную каталіцкую

ідэнтычнасць у частцы фармальна праваслаўнага насельніцтва Ёдскай воласці, што знаходзіла пэўны водгук. У сваю чаргу, іншыя сяляне не прымалі такой пропаведзі і паведамілі пра яе ў паліцыю. Аднак яны ўсведамлялі, што некаторыя іх аднавяскоўцы сапраўды шчыра схіляюцца да каталіцызму, а не толькі падбухторваюцца ксяндзамі і прыбышамі-прапаведнікамі. Пры гэтым праваслаўныя святары бачылі вытокі нетрываласці канфесійнай прыналежнасці часткі сваіх прыхаджан якраз у дзейнасці ксяндзоў, якіх яны асэнсоўвалі як асноўных арганізатараў таемнай пропаведзі каталіцызму.

## Крыніцы і літаратура

1. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA). – Ф. 605. Воп. 9. Спр. 508. – Справа аб спакушэнні селянінам А. Рэутам праваслаўнага насельніцтва ў каталіцызм. 09.06.1900–26.04.1902. – 25 арк.

2. Извеков, Н. Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889 г. / Н. Д. Извеков. – Москва : Печатня А. И. Снегиревой, 1899. – 522 с.

3. Устав уголовного судопроизводства. – Санкт-Петербург: Типография Второго Отделения Собственной Е. И. В. Канцелярии, 1867. – VII, XXV, 523 с.